**20.** Прачытайце верш М. Пазнякова:

*На балоце*
*Журавіны,*
***Як жарыначкі,***
*Гараць.*
*Не тушыць, сябры, прыходзьце,*
*А ў вядзерцы іх збіраць.*

Чым з’яўляецца выдзелены выраз?

**А)** метафарай. **Б)** зваротам. **В)** параўнаннем.
**Г)** гіпербалай. **Д)** эпітэтам.

**21.** Вызначце словы, у якіх правільна выдзелены націскны галосны:

*1) **а**ер; 2) блытан**і**на; 3) к**а**менны; 4) ар**а**хіс;*
*5) жаўн**а**; 6) зас**е**нь; 7) круп**я**ны.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 4, 6 **В)** 2, 4, 5. **Г)** 2, 4, 7. **Д)** 3, 4.

**22.** У якім слоўніку беларускай мовы можна даведацца пра гісторыю паходжання слова?

**А)** тлумачальным. **Б)** арфаграфічным. **В)** этымалагічным.
**Г)** фразеалагічным. **Д)** марфемным.

**23.** Кожны празаічны твор мае пэўную кампазіцыйную паслядоўнасць. Выберыце правільны варыянт.

**А)** зачын, кульмінацыя, развязка, канцоўка, завязка.
**Б)** кульмінацыя, развязка, зачын, завязка, канцоўка.
**В)** завязка, зачын, развязка, кульмінацыя, канцоўка.
**Г)** зачын, завязка, кульмінацыя, развязка, канцоўка.
**Д)** зачын, завязка, канцоўка, кульмінацыя, развязка.

**24.** Выберыце з прыведзеных толькі назвы раздзелаў, з якіх складаецца навука аб мове:

*1) графіка; 2) фальклор; 3) марфалогія;*
*4) стылістыка; 5) фанетыка; 6) эпас.*

**А)** усе назвы. **Б)** няма такіх назваў. **В)** 1, 2, 5.
**Г)** 1, 3, 4, 5. **Д)** 2, 6.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА.*
*тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01; e-mail: info@bakonkurs.org*
*http://www.bakonkurs.org/*

ГА «БА «Конкурс». Заказ 9. Тыраж 22500 экз. г. Мінск. 2008 г.

# Конкурс па беларускай мове
# “БУСЛІК-2008”

*Чацвер, 21 лютага 2008 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Колькі складоў у слове ***буслік***?

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 6.

**2.** Пра які зімовы месяц у народзе гавораць, што ён *«зямлю грудзіць, хаты студзіць, год канчае, зіму пачынае»*?

**А)** студзень. **Б)** люты. **В)** лістапад.
**Г)** снежань. **Д)** кастрычнік.

**3.** Колькі разоў сустракаецца гук **[*ш*]** у скорагаворцы:
*Мама мышка сушыла шышкі, мышка-малышка мыла лыжкі.*

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 6. **Г)** 7. **Д)** 8.

**4.** Устаўце патрэбнае слова ў вершаваны радок Э. Агняцвет:

*У шпакоўні пуста, ціха:*
*Дзесь на ... шпак, шпачыха.*

**А)** поўначы. **Б)** поўдні. **В)** захадзе.
**Г)** усходзе. **Д)** шпацыроўцы.

**5.** Колькі слоў у сказе:

*Надлесамвышэйпаднялосясонцаіўсміхнуласязямлі.*

**А)** 5. **Б)** 6. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 9.

**6.** Дадзены словы: *1) панядзелак; 2) заўтра; 3) аўторак; 4) чацвер*. Якое з іх лішняе?

**А)** няма лішняга слова. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**7.** Сымонку неабходна было назваць адным словам малюнкі, на якіх мастакі адлюстроўваюць лясы, палі, лугі, рэкі, прыроднае асяроддзе. Ён вырашыў, што гэта – …

**А)** кніга. **Б)** апавяданне. **В)** партрэт.
**Г)** пейзаж. **Д)** апісанне.

**8.** Вучань запісаў пад дыктоўку сказ: *У Піліпа было ня больш семі капеяк*. Колькі памылак дапусціў хлопчык?

**А)** памылак няма. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**9.** Колькі гукаў у слове ***раздзьмуць***?

**А)** 2. **Б)** 6. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 10.

**10.** Вызначце правільна напісанае слова:

**А)** светафор. **Б)** святлафор. **В)** светлафор.
**Г)** святлафар. **Д)** святафор.

**11.** Колькі асабовых назоўнікаў ужыта ў вершы І. Шуцько «Сняжок»?

*Закружыліся сняжынкі,*
*Ну, нібыта матылькі,*
*Надзя – шустрая дзяўчынка –*
*Ловіць іх у дзве рукі.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**12.** Якога дзеяслова не хапае ў вершаваным радку А. Пысіна:

*У дубах салаўі адсвісталі, … над плугам жаўрук.*

**А)** адзваніў. **Б)** стаміўся. **В)** адзвінеў.
**Г)** адчырыкаў. **Д)** адпрацаваў.

**13.** У якіх словах не трэба пісаць мяккі знак?

*1) аген..чык; 2) с..вет; 3) песен..ка;*
*4) ялін..ка; 5) нос..біт; 6) раз..ба.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 4. **Г)** 2, 6. **Д)** 3, 5, 6.

**14.** Закончыце народнае выслоўе: *Хто ўлетку цяньку шукае, той узімку …*

**А)** добра засынае. **Б)** галадае. **В)** на печы грэецца.
**Г)** парыцца. **Д)** лётае.

**15.** Колькі назоўнікаў адзіночнага ліку назоўнага склону можна ўтварыць з гукаў [***а***], [***л’***], [***п***], [***і***]?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**16.** Значэнне якіх слоў з прыведзеных змяняецца са зменай месца націску?

*1) паўза; 2) кара; 3) цэгла; 4) каса; 5) жыта; 6) каралі.*

**А)** усіх слоў. **Б)** 1, 2, 5. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 4, 6. **Д)** 2, 3, 4.

**17.** Сымонка ніяк не можа адгадаць загадку Міхася Пазнякова, бо літары адгадкі пераблыталіся. Дапамажыце хлопчыку.

*Знаходзіцца дома*
*У сонечны дзень.*
*А вось у дажджлівы*
*Гуляць ён ідзе.*

**А)** с, а, р, о, а, п, н. **Б)** ы, ж, к, в, о. **В)** о, в, з, к, а, н.
**Г)** т, о, к, р. **Д)** ц, я, с, е, м.

**18.** Вызначце, колькі мяккіх зычных гукаў ва ўсіх словах сказа:

*У небе засвяціліся першыя зоркі.*

**А)** 5. **Б)** 6. **В)** 8. **Г)** 10. **Д)** 11.

**19.** Дадзена слова ***добры***. Выберыце з прыведзеных слоў антонімы да гэтага слова:

*1) чужы; 2) благі; 3) спагадлівы;*
*4) родны; 5) сумны; 6) далёкі.*

**А)** няма антонімаў. **Б)** 1, 2, 6. **В)** 2.
**Г)** 3, 4, 5. **Д)** 6.